**Задача.** В вазе было 8 груш, это на 3 больше, чем яблок. Сколько всего фруктов было в вазе?

Вместе с задачей ученик получает карточку, на которой записано два варианта решения, одно из которых неверно:

1) (8 + 3) + 8 = 19.

2) (8 – 3) + 8 = 13.

Задание состоит в следующем: «Внимательно прочти задачу и выбери правильное решение». Для выбора правильного решения ученику необходимо произвести анализ предложенных вариантов решения в плане установления соответствия арифметических действий характеру отношений между данными задачами.

Таким образом, при формировании самоконтроля на уроках математики необходимо систематизировать работу, а именно создать сначала потребность в самоконтроле. На уроках математики младшим школьникам иногда могут быть даны задания, в которых правильность уже известного ответа будет выяснена в результате проверки. Учителю необходимо объяснить ученикам, что при решении любой задачи необходимо проверять не только конечный результат, но и промежуточный.

**Список использованной литературы**

1. Заровская, В. А. Самоконтроль и взаимоконтроль в начальных классах / В. А. Заровская // Молодой ученый. – 2016 – № 8 (112). – С. 955–957.

2. Словарь русского языка / под ред. чл.-кор. АН СССР Н. Ю. Шведовой. – М. : Рус. яз., 1989. – 534 с.

3. Профессиональное образование: Словарь. Ключевые понятия, термины, актуальная лексика. – М. : ПМЦ СПО, 1999. – 40 с.

4. Карпенко, Л. А. Краткий психологический словарь / под общ. ред. А. В. Петровского, М. Г. Ярошевского. – М. : Политиздат, 2015. – 431 с.

5. Ушинский, К. Д. Педагогические сочинения / К. Д. Ушинский. – М. : Педагогика, 2013. – 340 с.

6. Эльконин, Д. Б. Избранные психологические труды / Д. Б. Эльконин. – М. : Междунар. пед. академия, 1995. – 96 с.

**Г. М. КАНЦАВАЯ**
Брэст, УА "БрДУ імя А. С. Пушкіна"

## ФАРМІРАВАННЕ ПАЗНАВАЛЬНЫХ УНІВЕРСАЛЬНЫХ ВУЧЭБНЫХ ДЗЕЯННЯЎ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Найважнейшай задачай сучаснай сістэмы адукацыі з'яўляецца фарміраванне ўніверсальных вучэбных дзеянняў (УВД), якія забяспечваюць школьнікам уменне вучыцца, здольнасць да самаразвіцця і самаўдаскана-

лення. На I ступені агульнай сярэдняй адукацыі прадмет “Беларуская мова” выступае асновай развіцця ў вучняў комплексу УВД, часткай якога з’яўляюцца пазнавальныя УВД, якія ўключаюць дзеянні даследавання, пошуку, адбору і структуравання неабходнай інфармацыі, развіваюць здольнасць да пазнання навакольнага свету. Да пазнавальных УВД адносяцца ўменні чытаць і слухаць, знаходзіць патрэбную інфармацыю, ажыццяўляць аперацыі аналізу, сінтэзу, параўнання, класіфікацыі, устанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі, рабіць абагульненні, вывады [1]. Уключэнне ва ўрок новых прыёмаў навучання дазваляе вывесці на новы ўзровень вучэбна-пазнавальную цікавасць, павышае разнастайнасць працэсу навучання. Праблемнае навучанне не толькі дазваляе выкарыстоўваць прыёмы і метады працы ў адпаведнасці з пазнавальнымі цікавасцямі дзяцей, але і спрыяе авалоданню такімі элементамі лагічных дзеянняў, як параўнанне, класіфікацыя, вылучэнне прымет прадметаў, вызначэнне знаёмага паняцця праз род і відавыя адрозненні, развівае ўменні рабіць найпрасцейшыя вывады. Вучням ствараецца праблемная сітуацыя і прапануецца самім знайсці спосаб яе вырашэння. Пры гэтым вучэбная сітуацыя павінна выклікаць патрэбу і жаданне яе вырашыць.

Займальнымі і цікавымі для дзяцей прыёмамі, якія дазваляюць развіваць лагічнае мысленне, выказваць здагадку, з’яўляюцца прыёмы “Лесвічка”, “Пірамідка”, калі вучням прапануецца прагаварыць услых назвы прадметаў або малюнкаў у прадстаўленай паслядоўнасці і запомніць іх; прайграць па памяці размяшчэнне прадметаў (малюнкаў) да перастаноўкі і пасля яе з вусным апісаннем.

Вельмі эфектыўны педагагічны прыём “Дыктоўка значэнняў”. Настаўнік прагаворвае не словы, а іх значэнні. Вучні вызначаюць словы і запісваюць іх. Гэта развівае разумовую дзейнасць, уменне рабіць вывады, па прыметах вызначаць значэнне.

Хвілінкі чыстапісання таксама садзейнічаюць развіццю найважнейшых інтэлектуальных якасцяў асобы, стымулююць развіццё маўлення, аналітыка-сінтэтычнага і лагічнага мыслення. Падчас іх правядзення ажыццяўляюцца:

– нетрадыцыйныя віды фанетычнага разбору (Прачытайце запісаныя на дошцы словы (папера, клас, ледзяны). Вызначыце літару, якую мы будзем пісаць сёння на хвілінцы чыстапісання. У адным са слоў яна абазначае няпарны звонкі зычны гук. Якая гэта літара? У якім слове яна знаходзіцца?);

– частковы разбор слоў па саставе (Вызначыце літару, якую мы напішам на хвілінцы чыстапісання. Яна ёсць у корані кожнага з прапанаваных слоў (мясісты, узлесак, закваска). Якая гэта літара?);

– слоўнікавыя дыктоўкі ў нетрадыцыйнай форме (на дошцы запісаны словы з прапушчанымі арфаграмамі: л..снік, бяро..ка, в..сковы, л..довы,

гарбу.., з..мны, ні..кі. *Заданне:* Назавіце літары, якія мы будзем пісаць на хвілінцы чыстапісання. З іх дапамогай можна падзяліць прапанаваныя словы на групы. Якія гэта літары? Па якой прымеце вы падзялілі словы на групы?);

– прыём “Я ўважлівы!” (вучням прапануецца разгледзець карцінку з выявай літар, якія ім трэба будзе напісаць: “Разгледзьце карцінку. Якую літару мы будзем сёння пісаць? Якая літара сустракаецца часцей за іншыя? Колькі разоў яна паўтараецца? Хто з нас самы ўважлівы? (Р Я У Х БО ХР М У Г РНР)”).

У 2–3 класах выкарыстоўваюцца педагагічныя прыёмы, накіраваныя на выкананне практыкаванняў, якія патрабуюць ад вучняў больш складанай і актыўнай свядомай дзейнасці, напрыклад прыём “Я ведаю”. Малодшым школьнікам прапануецца пазнаёміцца з шэрагам літар: *т, п, к, е, н, б, с* і растлумачыць, якую літару яны будуць пісаць.

Прыём “Адгадай!” прадугледжвае выкананне практыкаванняў, дзе акцэнт робіцца на развіццё абстрактнага мыслення і вуснага маўлення. Малодшыя школьнікі расшыфроўваюць запіс і вызначаюць літару: 5 – 3 – 1 = Д – в – ? (Літара А). Падобныя практыкаванні накіраваны на развіццё аналітыка-сінтэтычнага мыслення і маўленчых здольнасцяў вучняў.

Абавязковым структурным этапам урока берускай мовы з’яўляецца слоўнікава-арфаграфічная праца, якая таксама грунтуецца на актыўным і свядомым удзеле вучняў у вызначэнні новага «цяжкага» слова. Для вызначэння лексічнага значэння слоў выкарыстоўваецца прыём “Этымалагічны слоўнік”. Новае слова ўводзіцца ў актыўны слоўнік дзяцей праз выкарыстанне прыказак, прымавак, фразеалагізмаў. Тлумачэнне сэнсу фразеалагізмаў, іх паходжання ўключае малодшых школьнікаў у актыўную разумовую дзейнасць, прымушаючы задумацца над значэннем слоў і выразаў.

На развіццё лагічнага мыслення і маўлення накіраваны прыём “Слоўнікавы аўкцыён”, дзе вучням прапануецца назваць словы, тэрміны, імёны, геаграфічныя назвы па адной тэме. Гэта могуць быць таксама словы-апісаннні ці словы, якія характарызуюць прадмет. Перамагае той, хто больш ведае слоў і назаве слова апошнім.

Важнае значэнне для развіцця пазнавальных уменняў мае сумесная пошукавая дзейнасць настаўніка і вучняў. Для азнаямлення з новымі лінгвістычнымі паняццямі і правіламі выкарыстоўваецца прыём “Сінонімы”. Малодшым школьнікам прапануецца скласці сінанімічныя рады і пары, дакладна падабраць патрэбнае слова, вылучыць словы-сінонімы ў тэксце і ў маўленні. Гэта дазваляе ўзбагаціць слоўнікавы запас вучняў, павысіць іх веды пра словы-сінонімы і развіць уменне працаваць з імі.

Вельмі цікавым прыёмам з’яўляецца прыём “Так – не”, які накіраваны на фарміраванне ўмення звязваць разрозненыя факты ў адзіную карціну,

сістэматызаваць наяўную інфармацыю, слухаць і чуць адзін аднаго. Настаўнік загадвае нешта (лік, прадмет, літаратурнага героя, гістарычную асобу). Вучні спрабуюць знайсці адказ, задаючы пытанні, на якія настаўнік адказвае толькі словамі “так”, “не”, “і так, і не”. Напрыклад: 1) Гэта часціна мовы? (Так.); 2) Гэта службовая часціна мовы? (Не.); 3) Гэта самастойная часціна мовы? (Так.); 4) Абазначае прадмет? (Не.); 5) Абазначае дзеянне прадмета? (Так.); 6) Адказвае на пытанні *што рабіць? што зрабіць?* (Так.); 7) Гэта дзеяслоў!

Развіццю ўменняў абагульняць, супастаўляць факты, г. зн. ажыццяўляць пошук, спрыяе прыём “Кросенс” – асацыятыўны ланцуг, замкнёны ў поле з дзевяці квадратаў. У кросенсе выявы расстаўлены такім чынам, што кожная карцінка мае сувязь з папярэдняй і наступнай, а цэнтральная аб’ядноўвае па сэнсе адразу некалькі. Сувязі могуць быць як павярхоўнымі, так і глыбіннымі, але ў любым выпадку гэта выдатнае практыкаванне для развіцця лагічнага і творчага мыслення. Выкарыстанне кросенса на ўроку мае шмат варыянтаў. Падабраныя ў пэўнай логіцы выявы могуць быць выкарыстаны на любым этапе.

У 3–4 класах вучням прапануюцца заданні, якія спрыяюць развіццю якасцяў інтэлекту. Вельмі важны прыём антыцыпацыі. З дапамогай антыцыпацыі (здагадкі, разумовага апярэджвання) вучань, працуючы з тэкстам, забягае ў думках наперад. Ён не толькі разумее тое, пра што гаворыцца ў тэксце, але і здагадваецца (па логіцы развіцця думкі аўтара), што будзе далей. Вучань ператвараецца ў своеасаблівага суаўтара [2], ён сам “піша” працяг. Такая пазіцыя выклікае высокую інтэлектуальную актыўнасць, якую можна выкарыстоўваць для напісання самастойных апавяданняў або твораў: “Чаму сумуе сшытак?”, “Аб чым плача лядзяш?”, “Апавяданне на адну літару”, “Дакранёмся да шчасця”, “Уяві сябе дажджом”, “Калі б я стаў чараўніком…” і інш. Тэмамі твораў могуць стаць прыказкі “Цёплае слова і ў мароз сагрэе”, “Сябар пазнаецца ў бядзе” і інш.

Важную ролю ў развіцці пазнавальных УВД, фарміраванні ўмення шукаць інфармацыю, авалодваць дзеяннямі мадэлявання адыгрывае праектная дзейнасць, якая дазваляе сфарміраваць у вучняў уменні назіраць, параўноўваць, мадэляваць, вылучаць гіпотэзы, эксперыментаваць, вызначаць паняцці, устанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі і працаваць з крыніцамі інфармацыі. Праектная дзейнасць выпрацоўвае ўменні слухаць і чуць суразмоўцу, фармуляваць і ацэньваць пазнавальныя пытанні, праяўляць самастойнасць у навучанні [3]. Для выбару тэмы можна скарыстацца гульнявым прыёмам “Тысяча чаму?” Выбар тэмы праекта можна пачаць са слова “чаму?”: “Чаму агонь чырвоны?”, “Чаму Дзед Мароз прыходзіць у Новы год?”, “Чаму я люблю беларускую мову?” і інш. Пасля выбару тэмы даследавання праца будуецца па алгарытме праектнай дзейнасці.

Такім чынам, выкарыстанне эфектыўных педагагічных прыёмаў на ўроках беларускай мовы спрыяе фарміраванню пазнавальных УВД і павышае пазнавальную актыўнасць вучняў пачатковых класаў, садзейнічаючы рэалізацыі асноўнай мэты пачатковага навучання – дапамагчы малодшаму школьніку ў самарэалізацыі, развіцці здольнасцяў, якія забяспечваюць магчымасць паспяховага навучання на наступнай ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Осмоловская, И. М. Формирование универсальных учебных действий у учащихся начальных классов / И. М. Осмоловская, Л. Н. Петрова // Нач. шк. – 2012. – № 10. – С. 6–10.

2. Медведева, Н. В. Формирование и развитие универсальных учебных действий в начальном общем образовании / Н. В. Медведева // Нач. шк. плюс До и после. – 2011. – № 11. – С. 17–23.

3. Актуальные вопросы формирования интереса в обучении : учеб. пособие / под ред. Г. И. Щукиной. – М. : Просвещение, 1984. – 176 с.

**Г. М. КАНЦАВАЯ, К. А. СІМАНЮК**
Брэст, УА “БрДУ імя А. С. Пушкіна”

## ПРАЦА ПА РАЗВІЦЦІ ГРАМАТЫЧНАГА ЛАДУ МАЎЛЕННЯ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ З ВЫКАРЫСТАННЕМ ТЭХНАЛОГІІ ВУЧЭБНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА

Тэрмінам “вучэбнае супрацоўніцтва” абазначаецца шматбаковае ўзаемадзеянне ўнутры вучэбнай групы і ўзаемадзеянне настаўніка з групай [1].

М. С. Салавейчык лічыць, што вучэбнае супрацоўніцтва – гэта асаблівая форма адносін дзіцяці і дарослага, неабходная для паўнавартаснага засваення тэарэтычных паняццяў. Вучэбнае супрацоўніцтва накіравана на агульныя для ўсіх людзей спосабы мыслення і дзеяння, а не на ўнікальную непаўторнасць кожнага чалавека. Вучэбнае супрацоўніцтва накіравана на вынік, а вынікам яго з’яўляюцца новыя спосабы дзеяння, асвоеныя дзіцем [2].

Прывядзём прыклад арганізацыі калектыўнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў пачатковых класаў з мэтай фарміравання ўмення складаць сказ на пэўную тэму.

1. Клас дзеліцца на групы для вырашэння канкрэтных задач, кожная група атрымлівае і сумесна выконвае пэўнае заданне (агульнае або дыферэнцаванае). Напрыклад, кожнай групе прапаноўваецца адно і тое ж заданне: *Прачытайце. Пра якую пару года гаворыцца ў гэтым тэксце?*

Яшчэ нядаўна шчэбет птушак напаўняў гушчар. А цяпер ціха і глуха ў лесе. Птушкі перасталі спяваць. Лісце пажаўцела. Часта ідуць дажджы (Паводле Я. Коласа).

*Складзіце 5 сказаў пра восень.*